


Добры дзень, сябры! Пішуць вам выхаванцы Выверскага дзіцячага сада Маладзечанскага раёна. Мы хочам з вамі пасябраваць і ў сваім лісце расказаць вам аб нашай малой Радзіме-аграгарадку Выверы. Гісторыя **Вывер** пачынаецца з XVII стагоддзя. Назва вёскі, магчыма, пайшла ад лацінскага слова “vivere”, што азначае “жыць”. Так як на месцы вёскі спачатку быў толькі адзін фальварак, то ўладальнік-шляхціч запраста мог назваць гэтае месца – “Віверы”. Тутэйшыя старажылы заўсёды вымаўлялі назву сваёй вёскі з мяккім “В”- ВІВЕРЫ”

Так атрымалася, што першыя звесткі аб Выверах звязаны з іменем **Томаша Зана**- польскага паэта- рамантыка, матэматыка- музеязнаўца, грамадскага дзеяча, прызнанага важака моладзі. Выверы былі селішчам Занаў з 1811 па 1819 гады, пакуль уладальнікі фальварка Юшынскія не прадалі яго **Міхалу Агінскаму.** Тут прайшлі самыя яркія дзіцычыя і юнацкія гады Томаша Зана. У зборніку “Перапіска філаматаў” у пяці тамах вельмі часта мільгае гэта назва, праўда трохі перайначаная- Іверы: сюды, да бацькоў ляцелі з Вільні многія лісты. Томаш Зан сюды прыязджаў на канікулы, тут любіў блукаць па ваколіцах. Першыя ўпамінанне аб Выверах ў гістарычных крыніцах у 1636 годзе. На 01.01.2016г.у аграгарадку 231 двор, 649 жыхароў. Да паслуг жыхароў 1 магазін, ФАП, бібліятэка, храм Святога Панцелеймона, кафэ- бар “Крыстына”.

У цяперашні час Выверы - аграгарадок у Маладзечанскім раёне Мінскай вобласці. Уваходзіць у склад Мясоцкага сельскага выканаўчага камітэта. Калі дабірацца ў аграгарадок грамадскім транспартам з горада Маладзечна, то выходзіць трэба на прыпынку "Крыніца". Прама з прыпынку відаць прыдарожнае кафэ "Крыстына", якое выканана ў стылі сярэднявечнага мураванага замка - абкладзена прыродным каменем і існуе тут ужо шмат гадоў. Уся тэрыторыя запоўнена рознымі дэкарацыямі: драўлянымі скульптурамі жывёл, альтанкамі з лазы. Кафэ Крыстына " - адно з лепшых месцаў для адпачынку ў горадзе Маладзечна і раёне. Цікава будзе пабываць і турыстам з іншых гарадо ў і нават краін.















У нашым аграгарадку шмат падобных дамоў сядзібнага тыпу. Шмат двухпавярховых дамоў. Ня цяжка здагадацца, што ў адным з такіх дамоў пражывае ўладальнік кафэ "Крыстына". Каму яшчэ прыйдзе ў галаву абкласці двухпавярховы дом прыродным каменем.



## *Будынак сельскага выканаўчага камітэта*



## *ДУА "Выверскі вучэбна-педагагічны комплекс базавая школа-дзіцячы сад" Маладзечанскага раёна*



Выверская школа для вёскі- цэнтр культуры і адукацыі.

У 1937 годзе- адкрыта 4- класная польская школа ў хаце, дзе працавала настаўніца-полька.

- 1939г- школа стала беларускай пачатковай.
- 1944г.- школа стала сямігодкай.
- 1966- школа стала сярэдняй агульнаадукацыйнай. Адбыўся I фестываль “Дружба- 1966” паміж школамі г. Прыекуле (Латвія), г. Салантай (Літва), г.Тырва (Эстонія), г.Гдоў (Расія), в.Выверы (Беларусь)
- 1974г.- пабудавана новая двухпавярховая школа.
- 1975 г.- пабудавана прыбудова (цяпер тут ФАП і бібліятэка).
- 1978 г.- адкрыты дзіцячы сад- яслі калгаса “Усход”

- 1986г.- пачатак пераходу школы на 11- гадовае навучанне. Абсталяванны камп’ютэрны клас.
- 2014 г.- сярэдняя школа атрымала назву ДУА “Выверскі навучальна- педагагічны комплекс дзіцячы сад- базавая школа Маладзечанскага раёна”.
- 2014 г. на базе школы пры аб’яднанні сельскай і школьнай бібліятэк створана інтэграваная бібліятэка аграгарадка Выверы.

На дадзены момант у школе навучаюцца 83 чалавекі.

Наш дзіцячы сад размяшчаецца ў асобным ад школы будынку, але на адной тэрыторыі. Дзіцячаму садку ўжо больш за 40 гадоў. У ім выхоўваецца 22 дзіцяці. У нашым садзе самыя лепшыя выхавальнікі, шмат цікавых кніг і гульняў. Самым цікавым з'яўляецца куток «Беларуская хатка». Але пра гэта мы распавядзем вам у наступным нашым лісце.



*Храм Святога Панцелеймона*



*Фельчарска- акушэрскі пункт*

Дарагія сябры, напішыце нам, калі ласка, аб сваім горадзе або пасёлку, дзе вы жывяце, аб сваім дзіцячым садзе, дашліце фотаздымкі. Нам будзе вельмі цікава даведацца аб месцы, у якім вы жывяце. З нецярпеннем чакаем вашага адказу. Да пабачэння.